# СУЧАСНЫЯ ЎМОВЫ ТРАНСФАРМАЦЫІ І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ

***Н. Г. Мазурына,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта*
*імя Максіма Танка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларуская народная песенная традыцыя з’яўляецца тым элементам культуры, які разам з іншымі яе кампанентамі падвяргаецца бесперапыннаму развіццю і трансфармацыі. Спеўная культура ўключана ў сістэму народнай культуры і непасрэдна звязана з такімі яе кампанентамі, як матэрыяльная і духоўная культура ў цэлым, як народны светапогляд, народная мастацкая культура, сацыяльная, эканамічная, маральная культура, народная педагогіка і інш.

Асаблівасцю сучасных навуковых даследаванняў пытанняў трансфармацыі і развіцця беларускай народнапесеннай традыцыі стаў інтэгратыўны падыход. Ён дазволіў зрабіць пэўныя новыя адкрыцці на мяжы фалькларыстыкі і іншых галін навукі, выкарыстоўваючы іх метады і інструментарый. Так, творы традыцыйнага песеннага фальклору становяцца матэрыялам даследавання не толькі філолагаў і этнамузыколагаў, але і сацыёлагаў, культуролагаў, філосафаў, псіхолагаў, педагогаў, мастацтвазнаўцаў. Гэта дазволіла выявіць цэлы шэраг фактараў і ўмоў, якія уплываюць на развіццё народнапесеннай традыцыі як у Беларусі, так і ў свеце. Прычым назіраецца тэндэнцыя да іх усё большага пашырэння. Прыкладаў таму можна прывесці бясконцае мноства, таму спынімся толькі на некаторых тэарэтычных пытаннях тэмы дадзенага артыкула.

Сучасныя беларускія фалькларыстычныя школы, якія развіваюцца ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, у БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, БДУКМ, БДАМ, вывучаюць і выкарыстоўваюць беларускія народныя песні па-рознаму ў сілу сваёй спецыфікі.

Паказальным у гэтым плане выданнем з'яўляецца зборнік навуковых артыкулаў «Вулей і пчолы. Вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ» пад навуковай рэдакцыяй Р. М. Кавалёвай [1]. Адзін толькі пералік раздзелаў дазваляе меркаваць аб разнастайнасці напрамкаў і падыходаў у сучасных даследаваннях фальклору. Першы раздзел «Гісторыя – сучаснасць – перспектывы» распавядае аб фалькларыстычнай школе БДУ і яе сучасным стане, акцэнтуе ўвагу на патэнцыях развіцця навукі аб вуснай народнай творчасці, у прыватнасці на магчымасцях этнапсіхафалькларыстыкі. Другі раздзел «Класічная фалькларыстыка» раскрывае традыцыйныя метады даследавання фальклору як мастацтва слова, якія захоўваюць свае пазіцыі ў сучасным свеце. У раздзеле «Параўнальная фалькларыстыка» аўтары паказваюць важнасць факталагічнага кантэксту для разумення адметнасці нацыянальнага фальклору беларусаў. Даследаванне міфалагічнага як часткі семантыкі і паэтыкі фальклорнага твора стала асновай раздзела «Міфафалькларыстыка». Наступныя тры раздзелы – «Этнафалькларыстыка», «Сацыяфалькларыстыка» і «Гендарная фалькларыстыка» прысвечаны разгляду ўласна фалькларыстычных праб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лем у этналагічным, сацыялагічным і непасрэдна гендарным аспектах.

Культурная прастора кожнага народа і свету ў цэлым заўсёды была і застаецца структурай зменлівай. Не сакрэт, што ў інфармацыйным грамадстве ўзнікаюць і дзейнічаюць адрозныя ад традыцыйных спосабы перадачы назапашанага вопыту і ведаў. Змяняецца сацыяльная структура грамадства; урбанізацыя прыводзіць да страты фундаментальных асноў функцыянавання традыцыйнай народнай творчасці, якая ў Беларусі фарміравалася на аснове вясковага земляробчага ладу жыцця.

Рэтрансляцыя беларускага песеннага фальклору ў сучаснай культурнай прасторы набывае новае гучанне. Таму праца навукоўцаў, архівістаў, кнігавыдаўцоў, выкладчыкаў, выканаўцаў, студэнтаў, якія дапамагаюць культурныя здабыткі мінулага зрабіць прыналежнасцю сучаснага чалавека – неацэнная работа.

Песенны фальклор з'яўляецца сродкам захавання і перадачы рацыянальнага і эмацыянальнага вопыту чалавецтва. Спецыфіка традыцыйнага вуснага, харэаграфічнага, музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў заключаецца ў тым, што яны даводзяць да грамадскай свядомасці досвед зносін са з'явамі мастацтва, здабываюць з народных мастацкіх твораў неабходны духоўны матэрыял, які забяспечвае развіццё самога чалавека, яго духоўных сіл і ўніверсальных здольнасцяў. Яны тым самым спрыяюць развіццю творчага стаўлення да свету, падтрыманню пэўнага ўзроўню духоўнага багацця, фарміраванню матывацыі да пастаяннай творчай актыўнасці. У сучаснай філасофіі сфармулявана паняцце «светапоглядныя ўніверсаліі», якія датычаць сацыяльнага жыцця чалавецтва. В. С. Сцёпін падкрэсліваў: «Светапоглядныя ўніверсаліі выконваюць у жыцці грамадства такую ж функцыю, як і гены ў жывым арганізме. Яны арганізуюць у цэласную сістэму найскладанейшы набор розных феноменаў культуры і выступаюць у якасці базісных структур сацыякода, адыгрываюць ролю свайго роду ДНК сацыяльнага жыцця». Ён лічыць функцыянаванне ўніверсалій культуры падобным на ролю ДНК як своеасаблівай матрыцы сінтэзу бялкоў і іншых рэчываў. З яго пункту гледжання, «сістэма светапоглядных універсалій – гэта своеасаблівы культурна-генетычны код, у адпаведнасці з якім утвараюцца сацыяльныя арганізмы» [3, с. 18].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, увесь час адбываецца складаны працэс засваення і трансфармацыі сістэмы светапоглядных універсалій, якія ў нашай краіне, як і ў любой іншай, складваліся ва ўмовах своеасаблівага нацыянальнага гісторыка-культурнага развіцця.

Найлепшай формай працягу жыцця твораў вуснай народнай традыцыі з'яўляецца, безумоўна, непасрэднае перайманне, ад чалавека да чалавека. З гэтым выдатна спраўляюцца прадстаўнікі фальклорных народных і студэнцкіх калектываў, асобныя аматары-выканаўцы.

Другой найважнейшай формай захавання і зберажэння фальклорнай традыцыі з'яўляецца кніга, асабліва калі гэта датычыць публікацыі архіўных запісаў шматгадовай даўнасці, калі выканаўцы-носьбіты ўжо вельмі далёка на тым ці гэтым свеце. Да 30-годдзя Чарнобыльскай катастрофы выйшла кніга «Песні пакінутых вёсак» [2], створаная аўтарскім калектывам вопытных прафесіяналаў. Архіўныя матэрыялы, прадстаўленыя сучаснаму чытачу ў дадзенай кнізе, – гэта ўнікальная песенная спадчына, якая вылучаецца высокім густам і прадстаўлена ўпершыню. У кнізе змешчаны песні тых вёсак (Брагінскага, Хойніцкага, Ельскага і Нараўлянскага раёнаў), што цяпер знаходзяцца на тэрыторыі беларускага сектара адчужанасці 30-кіламетровага радыуса ад месца катастрофы агульнай плошчай больш 1300 квадратных кіламетраў, у зоне адсялення – тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Да аварыі тут існавала 96 населеных пунктаў, у якіх жылі больш за 22 тысячы жыхароў. І ў кожнай вёсцы гучалі песні: у святы і будні, сумныя і жартоўныя, шчадроўкі, балады, вясельныя напевы. Запісы рабіліся яшчэ да катастрофы, калі вёскі былі жывымі, поўнымі насельнікаў. Песні былі сабраны і запісаны падчас дзясяткаў фальклорна-этнаграфічных экспедыцый 1978, 1981 і 1982 гадоў супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Арганічнае злучэнне гісторыі, культуры, фальклору і традыцый сям'і, малой радзімы, краіны фарміруе духоўнае адзінства, якое прымае, усведамляе і засвойвае моладзь. Дапамагчы ім у гэтым – галоўная задача не толькі ўстаноў адукацыі, але і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іншых пазашкольных устаноў: цэнтраў творчасці, устаноў культуры, бібліятэк і г. д. Фальклор як сфера мастацкай творчасці, якая развівае менавіта вобразны бок мыслення асобы, належыць да ліку найбольш эффектыўных сродкаў выхавання творчай асобы. Для народнага мастацтва характэрны такія рысы, як традыцыйнасць, пераемнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, арыентаванасць на нацыянальны этычны і эстэтычны ідэал, жыццярадаснасць, глыбокая павага да майстра, настаўніка.

Сінкрэтызм этнакультурных кампанентаў служыць асновай для інавацыйнай адукацыйнай дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў, выпрацоўкі інавацыйных адукацыйных тэхналогій, прапанаваных асобнымі калектывамі ці педагогамі. У педагагічнай, філасофскай, культуралагічнай, іншай навуковай літаратуры пастаянна гучыць слова «цэласнасць» як галоўная тэндэнцыя фарміравання сучаснага культурнага тэксту не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. Сінкрэтызм народнага мастацтва ўтварае фундамент гэтай цэласнасці (інтэграцыі) і можа выкарыстоўвацца ў адукацыйнай дзейнасці педагагічных работнікаў усіх прыступак сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі.

Аналіз фактараў і механізмаў з’яўлення варыянтаў твораў народнапесеннага мастацтва не губляе сваёй навуковай актуальнасці да сённяшняга часу. Адна з цікавых і малавывучаных старонак у беларускай і ў цэлым у славянскай фалькларыстыцы – варыянтнасць праяў народнай творчасці.

У працэсе фарміравання ўяўленняў аб варыянтнасці народных песень у беларускай фалькларыстыцы можна вылучыць чатыры асноўныя этапы. Спачатку эмпірычным шляхам былі адкрыты факты існавання варыянтнага мноства народных песень, адрозненне мясцовых стыляў і традыцый, выяўлены шэраг прычын, што ўздзейнічаюць на ўзнікненне песенных варыянтаў (месца, час, асяроддзе, узрост і індывідуальныя здольнасці выканаўцы, форма бытавання). Увага да з’явы існавання беларускага песеннага фальклору ў варыянтах расла ў цеснай сувязі з назапашваннем фактычнага матэрыялу, ростам узроўню тэарэтычнай думкі фалькларыстаў.

Метад супастаўлення варыянтаў стаў адным з асноўных у працэсе даследавання праблем беларускай і ўсходнеславянскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фалькларыстыкі, выяўлення асаблівасцяў і заканамернасцяў бытавання фальклору. Аднак даследчыкі пастаянна сутыкаюцца з тым фактам, што для вырашэння сучасных задач навукі і практыкі неабходна прыцягваць веды і інструменты з іншых галін навукі. Непадзельнасць, цэласнасць, сінкрэтызм фальклорных з'яў і працэсаў з'яўляецца перадумовай для распрацоўкі тэарэтычных прынцыпаў інтэграванага падыходу як асновы для развіцця новых кірункаў традыцыйных навук.

Калі прааналізаваць высновы, да якіх прыходзяць розныя даследчыкі: фалькларысты, лінгвісты, мастацтвазнаўцы, этнографы, псіхолагі, то становяцца зразумелымі важныя акалічнасці. Вусная народная творчасць беларусаў, наша каляндарная і сямейна-абрадавая песенная спадчына з'яўляюцца аднымі з багацейшых не толькі сярод славянскіх і еўрапейскіх народаў, але і іншых народаў свету. Гісторыка-культурныя, геаграфічныя і іншыя ўмовы развіцця нашай радзімы садзейнічалі найлепшай кансервацыі, захаванню традыцыйнай культуры. Аб'яднанне намаганняў прадстаўнікоў навукі, культуры, адукацыі і мастацтва ў даследаваннях раскрывае шэраг прычын, механізмаў і заканамернасцяў трансфармацыі і развіцця беларускай народнапесеннай традыцыі.


*1.* Вулей і пчолы. Вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ : зб. навук. арт. / навук. рэд. Р. М. Кавалёвай ; уклад. В. В. Прыемка ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – 291 с.

*2.* Песні пакінутых вёсак / уступ. сл. Н. Г. Мазурына, Г. Р. Нячаева, Т. В. Валодзіна ; пасляср. : Ю. В. Пацюпа ; уклад. Т. В. Валодзіна, Н. Г. Мазурына (муз. частка) ; пад агул. рэд. А. І. Лакоткі. – Мінск : Беловагрупп, 2016. – 356 с.

*3. Степин, В. С.* Философия и эпоха цивилизационных перемен / В. С. Степин // Вопросы философии. – 2006. – № 2. – С. 16–26.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ